Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

№ 41 (1048). Кастрычнік 1968 г.

Год выдання 13-ы

Цана 2 кап.

Библиотека им. Ленина

МАГУТНАЙ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ ДЗЯРЖАВАЙ СТАЛА БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА ЗА 50 ГОД САВЕЦКАЙ УЛАДЫ. ЯНА СЛАВІЦЦА СТАНКАМІ І ЭЛЕКТРОННА-ВЫЛІЧАЛЬНЫМІ МАШЫНАМІ, ТЭЛЕВІЗАРАМІ І НАРУЧНЫМІ ГАДЗІННІКАМІ, КАМБАЙНАМІ І ЛЬНЯНЫМІ ТКАНІНАМІ, ТРАКТАРАМІ І АЎТАМАБІЛЯМІ. ГЭТЫЯ ВОЛАТЫ-САМАЗВАЛЫ, ЯКІЯ СФАТАГРАФАВАЎ НАШ КАРЭСПАНДЭНТ Я. ПЯСЕЦКІ НА ПЛЯЦОЎЦЫ БЕЛАРУСКАГА АЎТАМАБІЛЬНАГА ЗАВОДА, ХУТКА РАЗБЯГУЦЦА ПА УСЁЙ КРАІНЕ І ЗА ЯЕ МЕЖЫ, РАЗНОСЯЧЫ ПА СВЕЦЕ СЛАВУ АБ ЗАЛАТЫХ РУКАХ ЖОДЗІНСКІХ АЎТАМАБІЛЕБУДАЎНІКОЎ. НА ЗДЫМКУ ЎВЕРСЕ—АДЗІН З ТЫХ, ХТО РОБІЦЬ ГЭТЫЯ МАГУТНЫЯ МАШЫНЫ. ВАЛЕРЫЙ ГАНЧАРОЎ УЗНАЧАЛЬВАЕ ПЕРАДАВУЮ БРЫГАДУ ЗВАРШЧЫКАЎ У ПРЭСАВЫМ ЦЭХУ ЗАВОДА.

ЗАКЛІК ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі прыняў пастанову «Аб 50-годдзі Камуністычнай партыі Беларусі (1918—1968 гг.)», у якой гаворыцца:

У снежні 1968 года спаўняецца 50 гадоў Камуністычнай партыі Беларусі.

Кампартыя Беларусі была створана як састаўная і неад'емная частка адзінай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза на непахіснай аснове ленінскіх тэарэтычных, ідэалагічных і арганізацыйных прынцыпаў. На працягу паўстагоддзя пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК КПСС яна з гонарам выконвае ролю авангарда беларускага народа. КПБ узначаліла яго барацьбу за абарону заваёў Кастрычніцкай рэвалюцыі, умацаванне Савецкай улады, пабудову сацыялізма, за свабоду і незалежнасць сацыялістычнай Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер Кампартыя Беларусі арганізуе і накіроўвае намаганні працоўных рэспублікі на ажыццяўленне планаў камуністычнага будаўніцтва.

30—31 снежня 1918 года адбылася VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), якая, прыняўшы рашэнне аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, аб'явіла сябе I з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Гэты з'езд завяршыў працэс арганізацыйнага афармлення Камуністычнай партыі Беларусі.

Кампартыя Беларусі нарадзілася ў грозныя гады грамадзянскай вайны. Тысячы яе членаў самааддана змагаліся за маладую рэспубліку Саветаў на франтах, паказваючы ўзоры мужнасці і гераізму. Яны ўнеслі дастойны ўклад у перамогу, атрыманую народамі нашай краіны над аб'яднанымі сіламі ўнутранай і знешняй контррэвалюцыі. III з'езд КП(б)Б, які адбыўся 22—25 лістапада 1920 года, падвёў вынікі ўзброенай барацьбы працоўных Беларусі за Савецкую ўладу і паставіў галоўнай задачай КП(б)Б усямернае ўмацаванне дыктатуры пралетарыяту, устанаўленне ў рэспубліцы ўзорнага савецкага парадку, ажыццяўленне смелых рэвалюцыйных пераўтварэнняў.

Камуністычная партыя Беларусі выступіла арганізатарам сацыялістычнай індустрыялізацыі рэспублікі, гаворыцца далей у пастанове. Выконваючы рашэнні XIV з'езду ВКП(б), яна мабілізавала ўсе сілы і сродкі на стварэнне цяжкай прамысловасці. У выніку за гады даваенных пяцігодак у Беларусі былі створаны буйное машынабудаванне, энергетычная, лёгкая, харчовая, тарфяная і іншыя галіны прамысловасці. У структуры занятага насельніцтва значна павялічылася доля рабочага класа, узрасла яго палітычная актыўнасць, умацавалася кіруючая роля ў грамадстве.

Камуністычная партыя Беларусі паспяхова вырашыла і другую важную задачу сацыялістычнага будаўніцтва, ажыццявіўшы калектывізацыю сельскай гаспадаркі рэспублікі. Партыйныя арганізацыі разам з савецкімі органамі накіравалі на работу ў вёску тысячы камуністаў і беспартыйных актывістаў, стварылі сотні ма-

[Заканчэнне на 2-й стар.].

ЗАКЛІК ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

(Пачатак на 1-й стар.).

шынна-трактарных станцый, наладзілі масавую падрыхтоўку кадраў спецыялістаў сельскай гаспадаркі, актывізавалі шэфскую дапамогу горада вёсцы. За кароткі тэрмін на аснове суцэльнай калектывізацыі быў ліквідаваны апошні эксплуататарскі клас—кулацтва. У вёсцы канчаткова перамог калгасны лад.

У ходзе стварэння і развіцця сацыялістычнай эканомікі КПБ правяла велізарную работу ў галіне культурнага будаўніцтва. У рэспубліцы была ліквідавана непісьменнасць, вырасла выхаваная на ідэях марксізма-ленінізма народная інтэлігенцыя, дасягнула сапраўднага росквіту беларуская сацыялістычная культура.

Поспехі ў будаўніцтве сацыялізма ў СССР, росквіт эканомікі і культуры Савецкай Беларусі аказалі велізарны ўплыў на рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі, на чале якога стаяла Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Мужная барацьба працоўных заходніх абласцей за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне завяршылася ўз'яднаннем іх у верасні 1939 года з Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Кампартыя Беларусі выступіла арганізатарам і натхніцелем барацьбы беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў. Кіруючыся дырэктывамі ЦК ВКП(б), яна з'явілася арганізатарам ажыццяўлення мабілізацыйных планаў, будаўніцтва абарончых збудаванняў, стварэння знішчальных атрадаў, народнага апалчэння. Кампартыя Беларусі накіравала асноўную частку свайго саставу ў дзеючую армію. Камуністы знаходзіліся на пярэднім краі барацьбы з фашызмам, асабістым прыкладам, сваёй мужнасцю і гераізмам натхнялі працоўных рэспублікі, вялі іх за сабой.

На часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі была створана разгалінаваная сетка партыйнага падполля, уплыў якога распаўсюдзіўся на ўсе гарады і раёны рэспублікі. Дзейнічалі 10 абкомаў, 185 міжрайкомаў, гаркомаў і райкомаў партыі, звыш 1 300 первічных партыйных арганізацый, якія аб'ядноўвалі ў сваіх радах больш як 35 тысяч камуністаў. Яны былі цэментуючай сілай, душой усенароднай партызанскай барацьбы. Актыўна праявілі сябе ў тыле ворага камсамольскае падполле, патрыятычныя антыфашысцкія арганізацыі. У гады акупацыі на тэрыторыі рэспублікі партыйныя і камсамольскія органы выдавалі і распаўсюджвалі сярод насельніцтва 162 газеты.

Усю арганізатарскую і палітычную дзейнасць у тыле ворага Кампартыя Беларусі падпарадкавала галоўнай задачы—усямернаму развіццю партызанскага руху і ўзмацненню ўдараў па ворагу. Толькі ў партызанскіх атрадах, падпольных арганізацыях і групах налічвалася звыш 440 тысяч патрыётаў, якія са зброяй у руках вялі гераічную барацьбу супраць фашысцкіх акупантаў.

Пасля разгрому гітлераўскай Германіі Камуністычная партыя Беларусі сканцэнтравала свае намаганні на аднаўленні і далейшым развіцці народнай гаспадаркі. Яна пастаянна ўдасканальвала формы і метады кіраўніцтва прамысловасцю, сельскай гаспадаркай, культурным будаўніцтвам, рабіла ўсё ад яе залежачае для хутчэйшай ліквідацыі вынікаў акупацыі, паляпшэння матэрыяльна-бытавых і культурных умоў жыцця працоўных.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі беларускі народ пры брацкай дапамозе ўсіх народаў Савецкага Саюза залячыў глыбокія раны вайны і ўключыўся ў актыўную барацьбу за магутны ўздым народнай гаспадаркі і культуры. На ўсіх участках вытворчасці ў авангардзе спаборнічаючых ідуць камуністы. Яны арганізуюць барацьбу за тэхнічны прагрэс, павышэнне прадукцыйнасці працы, хуткае развіццё вядучых галін сацыялістычнай эканомікі, усёй народнай гаспадаркі.

Рознабаковая палітычная і арганізатарская дзейнасць Кампартыі Беларусі прыносіць выдатныя вынікі ў стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, фарміраванні новых грамадскіх адносін, выхаванні чалавека будучыні. У рэспубліцы створаны зусім новыя галіны прамысловасці: аўтамабільная, трактарная, радыёэлектронная, дакладнага прыборабудавання, хімічная, нафтаздабываючая і нафтаперапрацоўчая. За апошнія 10 гадоў удзельная вага машынабудавання, электраэнергетыкі і хімічнай прамысловасці—галін, якія вызначаюць тэхнічны прагрэс, больш чым падвоілася. Цяпер за няпоўныя 5 дзён выпускаецца такая ж колькасць валавой прадукцыі, якая выпускалася ў дарэвалюцыйнай Беларусі за цэлы год. Энергетычныя прадпрыемствы БССР выпрацоўваюць электраэнергіі ў шэсць разоў больш, чым яе давалі электрастанцыі ўсёй царскай Расіі.

Па шляху няўхільнага ўздыму ідзе сельская гаспадарка, што дазволіла ператварыць Беларусь у край высокаразвітага земляробства і жывёлагадоўлі. У шырокім маштабе ажыццяўляецца механізацыя, электрыфікацыя і хімізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці, меліярацыя зямель. Змяняецца аблічча беларускай вёскі, расце агульнаадукацыйны і культурна-тэхнічны ўзровень сельскіх працаўнікоў.

Шпаркае развіццё прадукцыйных сіл рэспублікі з'яўляецца надзейнай асновай няўхільнага павышэння жыццёвага ўзроўню народа. За гады сямігодкі і два гады бягучай пяцігодкі нацыянальны даход у разліку на душу насельніцтва павялічыўся ўдвая, а грашовыя даходы выраслі ў 2,1 раза.

Беларускім народам, Кампартыяй Беларусі пройдзен слаўны паўвекавы шлях барацьбы і перамог. Камуністы, рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя Беларусі ганарацца выдатнымі поспехамі, дасягнутымі краінай і рэспублікай за гады Савецкай улады пад кіраўніцтвам КПСС. На ўсіх этапах будаўніцтва новага жыцця, барацьбы за светлыя ідэалы камунізма КПБ паслядоўна праводзіла і праводзіць у жыццё генеральную лінію партыі, захоўваючы вернасць непераможнаму сцягу вялікага Леніна. Выхаваная на ленінскіх традыцыях КПБ заўсёды была, ёсць і будзе верным баявым атрадам вялікай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Савецкі народ, працоўныя ўсіх краін свету рыхтуюцца адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Разглядаючы надыходзячы паўвекавы юбілей БССР і КПБ як працяг урачыстасцей, прысвечаных рэвалюцыі, і важны этап у падрыхтоўцы да святкавання 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча, партыйныя камітэты і партарганізацыі Беларусі настойліва ўдасканальваюць палітычную і арганізатарскую работу, узнялі шырокія масы працаўнікоў гарадоў і вёсак на стваральную творчую працу ў імя ажыццяўлення велічных планаў камуністычнага будаўніцтва.

Напярэдадні слаўнага юбілею БССР і КПБ Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі заклікае камуністаў і камсамольцаў, рабочы клас і калгаснае сялянства, дзеячоў навукі, культуры і мастацтва, усіх працоўных рэспублікі яшчэ цясней згуртавацца вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэта КПСС, мабілізаваць усе свае сілы і творчую энергію на дасягненне новых перамог у барацьбе за ажыццяўленне велічных планаў камуністычнага будаўніцтва.

ПРОКЛАДЫВАЯ НОВЫЕ

Академик Георгий ПЕТРОВ, директор Института космических исследований Академии наук СССР

Автоматические аппараты, созданные трудом советских ученых, инженеров, рабочих, первыми сфотографировали обратную сторону нашего спутника и передали снимки на Землю, совершили мягкую посадку на Луну и, наконец, уверенно проложили первую межпланетную трассу Земля — Луна — Земля.

Ни один из ранее запущенных к Луне автоматических аппаратов не был возвращен на Землю. Научная информация, полученная от многих советских и американских станций, передавалась по радиотелеметрическим каналам. Однако для решения некоторых важных проблем необходимо информацию непосредственно доставлять в приборах и в виде записей на Землю.

Эта задача была блестяще решена советской автоматической станцией «Зонд-5». Запуск ее, как известно, был осуществлен 15 сентября в ноль часов сорок две минуты московского времени.

Вместе с последней ступенью ракеты станция была выведена на околоземную орбиту искусственного спутника. И затем через шестьдесят семь минут сработала двигательная установка, которая придала станции вторую космическую скорость, то есть прибавила к первой около трех километров в секунду. Полет в сторону Луны продолжался. Примерно в шестидесяти тысячах километров была проведена коррекция траектории. Для ее проведения аппарат нужно было поставить под определенным углом.

Станция стабилизировалась по Солнцу и Земле. Таким образом был получен точно рассчитанный импульс, выправивший ее траекторию. Станция прошла примерно в 1950 километрах от поверхности Луны и начала обратный путь к нашей планете.

После небольшой поправки «Зонд-5» вошел в атмосферу Земли и достиг ее поверхности в заданном районе. Телеметрическая информация, полученная во время полета, говорила о нормальном функционировании всей бортовой системы и научной аппаратуры.

Одна из многих проблем, связанных с межпланетными перелетами, относится к тому сравнительно короткому периоду полета, когда космический аппарат, возвратившись с окололунной орбиты, входит в атмосферу Земли.

По-видимому, не будет большим преувеличением сказать, что возвращение в земную атмосферу и посадка аппаратов является одной из самых сложных проблем, стоящих сейчас перед космонавтикой. Мы уже научились уверенно сажать на землю космические аппараты с околоземной орбиты. Но осуществление посадки космических аппаратов, возвращающихся из межпланетного полета к Земле со второй космической скоростью, равной примерно одиннадцати километрам в секунду, является более сложной задачей.

Прежде всего, нужно было позаботиться о тепловой защите, поскольку станция подвергается исключительно интенсивному аэродинамическому нагреву. Искусственные спутники при входе в атмосферу имеют скорость около восьми километров в секунду. «Зонд-5» имел скорость около одиннадцати километров. Мощная ударная волна значительно усилила тепловые нагрузки. Температура вокруг аппарата, возвращающегося со второй космической скоростью, достигает тринадцати тысяч градусов против семивосьми тысяч для станций, летящих с первой космической скоростью. Напомню, что температура поверхности Солнца значительно меньше — около шести тысяч градусов.

Огромные температуры существенно влияют на величину так называемых радиационных тепловых потоков, которые превышают конвективные потоки, играющие главную роль при спуске аппарата с первой космической скоростью.

Радиационные потоки, кроме того, влияют и на характер обтекания тела. И все это должно быть строго учте-

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ

НОВЫ МАРШРУТ «ЭЦЮДА»

Аддзел збыту Мінскага радыёзавода адгрузіў за граніцу вялікую партыю транзістарных радыёпрыёмнікаў «Эцюд». Першым замежным пакупніком новага вырабу радыёзаводцаў стала Францыя.

Самы маленькі мінскі транзістар «Мікра» адпраўляецца ў тры зарубежныя адрасы. Яго купляюць Англія, Францыя і Швейцарыя.

ЗАЛАТЫЯ ЭКСПАНАТЫ

Мільёнаканальны аналізатар імпульсаў «АІМА-10 у шостай ступені», выраблены ў Інстытуце фізікі Акадэміі навук УССР, і ізатопная ўстаноўка для абпраменьвання «Гама-100», выстаўленыя ўсесаюзным аб'яднаннем «Ізатоп», атрымалі на Міжнародным кірмашы ў Брно найвышэйшую адзнаку — залатыя медалі.

Усяго на атрыманне трыццаці залатых медаляў было прадстаўлена 396 экспанатаў з 21 краіны. Большая частка медаляў па традыцыі была прысуджана айчынным узорам — 14. Частка «золата», якая прызначалася зарубежным гасцям, размеркавалася так: ГДР—3, Савецкі Саюз — 2, Англія, Аўстрыя, ЗША, ФРГ, Фінляндыя і іншыя — па 1 медалю.

Самая буйная здзелка, якая адбылася на Х кірмашы ў Брно, — кантракт на пастаўку Чэхаславакіі каляровых металаў з СССР на суму 600 мільёнаў крон.



Заканчваецца будаўніцтва плавальнага басейна ў гарадку мінскіх трактаразаводцаў. НА ЗДЫМКАХ: знешні і ўнутраны выгляд будынка басейна.

У цэхах Мінскага завода аўтаматычных ліній ідзе зборка агрэгатных станкоў і ліній, якія адпраўляюцца затым у розныя канцы Савецкага Саюза і многія краіны свету. НА ЗДЫМКУ: слесар-наладчык МЗАЛа Уладзімір ГАЛАХАЎ.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ

ТРАССЫ

но. Даже с большей точностью, чем при разработке аппаратов, входящих с первой космической скоростью.

Всякое незнание — а здесь ученые шли неизведанными тропами — прежде всего отражается на весе. Вес, вызеденный со второй космической скоростью, во много раз дороже, чем с первой.

Сопротивление воздуха, обтекание тела зависят не только от скорости космической станции, но и от угла, под которым она входит в атмосферу. Наибольшую силу нагрева тело испытывает при вертикальном вхождении. Это подтверждают метеоритные тела, летящие по таким траекториям и сгорающие в атмосфере.

С другой стороны, угол входа в атмосферу не должен быть слишком мал. В этом случае торможение невелико и очень трудно бывает обеспечить точное место посадки.

Наиболее удачная траектория лежит в очень узких пределах, чтобы аппарат не зарылся слишком круто (тогда будут весьма большие перегрузки и высокие тепловые потоки) и не прошел слишком полого — иначе он проскочит атмосферу Земли. Этот коридор — шириной порядка десяти километров — обеспечивает вхождение в заданный район с нужными десятикратными-двенадцатикратными перегрузками.

Поэтому успех посадки обеспечивается высокой точностью коррекции. Увеличение угла входа против оптимального на один градус приводит к возрастанию перегрузок на тридцать-сорок единиц. Для многих приборов такое отклонение недопустимо. Чтобы обеспечить рациональный путь вхождения, нужна исключительно точная и надежно работающая аппаратура управления.

Как показал полет автоматической станции «Зонд-5», все эти задачи были полностью решены. При этом все бортовые системы станции функционировали нормально. Полет в атмосфере прошел по баллистической траектории с расчетными перегрузками, а приводнение спускаемого аппарата осуществлено в заранее намеченное место.

Программа советской автоматической станции «Зонд-5», впервые в мире совершившей успешный облет Луны с возвращением на Землю, полностью завершена.

Этим советская наука и техника достигла нового этапа в завоевании космоса. Несомненно, что эксперимент, представляющий огромный интерес для наших ученых и для всего мира, открывает широкие перспективы дальнейшего исследования космических пространств Луны и планет солнечной системы автоматическими космическими аппаратами.

(АПН).



Цэгла, керамзіт, дрэнажныя трубкі выпускае для будаўнікоў і меліяратараў Віцебскі камбінат будматэрыялаў. На прадпрыемстве пашыраюцца вытворчыя плошчы, устанаўліваецца новае абсталяванне, мадэрнізуецца дзеючае. Нядаўна ўступіла ў строй дзеючых трэцяя печ другой чаргі. НА ЗДЫМКУ: вярчальныя печы керамзітавага цэха.

Фота Г. УСЛАМАВА.

«ФІАТ» СПРАЧАЕЦЦА З ВЕТРАМ

Аўтамабіль плаўна набірае скорасць. Секунда, другая... Дванаццатая — і стрэлка спідометра паказвае ўжо 80. Яшчэ нямнога часу —і машына імчыцца з гранічнай скорасцю — 140 кіламетраў у гадзіну.

Два гады савецкія і італьянскія канструктары выпрабоўвалі машыну «Фіат-124» на палігоне і на дарогах нашай краіны, даводзілі яе канструкцыю. У выніку ўнесены рад змяненняў, якія забяспечваюць добрую работу аўтамабіля ў нашых умовах. У канструктарскіх распрацоўках мадэль зафіксавана як «ВАЗ-2101», а выпускаць яе будзе завод, які ўзводзіцца ў Тальяці.

Якім жа будзе нозы аўтамабіль?

— Пры класічнай кампаноўцы (рухавік спераду, вядучыя колы заднія), — паведаміў карэспандэнту ТАСС галоўны канструктар Волжскага завода В. Салаўёў, — машына мае параўнаўча невялікія памеры. Але ў яе салоне свабодна размесцяцца пяць пасажыраў.

Абслугоўваць машыну нескладана. Дастаткова сказаць, што ў яе няма ніводнай кропкі шпрыцавай змазкі. Сістэма ахаладжэння закрытая, яна запаўняецца вадкасцю, якая не замярзае пры 40 градусах марозу, не выкіпае ў гарачыню.

Сегодня в номере

ДЛЯ ТЕХ, КТО НЕ ЧИТАЕТ ПО-БЕЛОРУССКИ

В декабре 1968 года исполняется 50 лет Коммунистической партии Белоруссии. Центральный Комитет КПБ принял постановление «О 50-летии Коммунистической партии Белоруссии (1918—1968 гг.)». 30—31 декабря 1918 года состоялась VI Северо-Западная областная конференция РКП(б), которая, приняв решение об образовании БССР, объявила себя 1-м съездом Коммунистической партии большевиков Белоруссии. Этот съезд завершил процесс организационного оформления Компартии Белоруссии. Коммунистическая партия Белоруссии выступила организатором социалистической индустриализации республики. Она успешно решила и вторую важную задачу социалистического строительства — коллективизацию сельского хозяйства. С первых же дней Великой Отечественной войны Компартия Белоруссии выступила организатором и вдохновителем борьбы против фашистских захватчиков. Под руководством Коммунистической партии при братской помощи всех народов Советского Союза белорусский народ залечил раны войны и включился в активную борьбу за мощный подъем народного хозяйства и культуры **[«ЗАКЛІК ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ», 1 стр.].**

Новостройкам Могилевщины посвящена статья **«ГІГАНТЫ» [3 стр.].** Каждый день более 25 тысяч рабочих поднимаются на строительные леса области. Возводятся корпуса заводов, фабрик, культурно-бытовые учреждения, школы, жилые дома. 50 тысяч тонн волокна лавсан будет давать в год химический гигант, который возводится на левом берегу Днепра в Могилеве. Вторая крупнейшая новостройка области—Бобруйский шинный завод. Он обеспечит пневматическими шинами белорусские тракторы, автомобили, сельскохозяйственные машины. Третья уникальная новостройка—Могилевский лифтостроительный завод. Свою первую продукцию он даст уже в будущем году.

25 лет не была на Родине Ядвига Серотинская. А приехав, увидела, как счастливо и зажиточно живет наш народ. Убедилась она и в том, что письма, которые писала ей сестра Нина Янусик в Австралию и в которых просила, «чтобы ей посылали посылки, потому что нечего есть», насквозь лживы. Н. Янусик работала заведующей сельским клубом в Хомске, жила в государственной квартире, причем, бесплатно пользуясь электроэнергией и топливом, имела большой приусадебный участок. Вымогая у заграничных родственников посылки, она продавала присланные вещи, а деньги тратила на пьянки. Жители Хомска дали заслуженную оценку поведению Н. Янусик, которая ради пестрых тряпок гатова клеветать на свой дом **[«ДУХОЎНАЕ ЖАБРАЦТВА», 5 стр.].**

Статья **«ВЫДАТНЫ МУЗЫКАНТ СУЧАСНАСЦІ» [6 стр.]** посвящена лауреату Ленинской премии, народному артисту СССР Давиду Ойстраху. Исключительный талант музыканта-виртуоза оценил еще в 1927 году русский композитор А. Глазунов. Скрипке Ойстраха аплодировали поляки, чехи, венгры, немцы, французы, англичане, финны, шведы, японцы, американцы... Стиль исполнения прославленного советского музыканта характеризует виртуозность игры, блестящая техника, безупречность интонации, правдивость, естественность. Давид Ойстрах известен не только как исполнитель. Великолепный педагог, он воспитал целую плеяду талантливых скрипачей. Событием в музыкальной жизни страны явились его выступления как дирижера.

На 8 стр. мы сообщаем нашим читателям о выходе в свет новой книжки библиотечки газеты «Голас Радзімы»—**«50 ВЕКАПОМНЫХ ГОД»,** посвященной нелегкому, но славному пути, который прошла Белорусская Советская Социалистическая Республика, созданная 1 января 1919 года. Из пятидесяти лет, прожитых белорусами при Советской власти, почти два десятилетия ушли на войны, которые навязали нам захватчики, и восстановление своего края. И все же за это время Белоруссия из отсталой окраины России превратилась в мощную индустриальную республику.

ГІГАНТЫ

Магілёўшчыну можна назваць велізарнай будаўнічай пляцоўкай. На яе рыштаванні штодзень узнімаецца звыш 25 тысяч рабочых. Будуюцца заводы і фабрыкі, дзесяткі карпусоў навучальных і культурна-бытавых устаноў, сотні жылых дамоў і спартыўных збудаванняў, масты і многае іншае — паўтары тысячы розных аб'ектаў. Аднак асаблівая гордасць вобласці — яе ўдарныя новабудоўлі.

...Лаўсан. Назву гэтаму новаму сінтэтычнаму валакну далі пачатковыя літары пяці слоў: «лавсан — лаборатория высокомолекулярных соединений Академии наук». Тут упершыню ў нашай краіне быў эксперыментальным шляхам атрыман лаўсан —валакно, якое мае цудоўныя якасці: змешанае з воўнай, бавоўнай ці льном, яно робіць тканіну трывалай і прыгожай. Яна не баіцца вільгаці і молі, не камечыцца, не выгарае на сонцы і не паддаецца ўсадцы. Вось такога валакна ў хуткім часе будзе даваць па 50 тысяч тон у год новы гігант хіміі, які ўзводзіцца на левым беразе Дняпра ў Магілёве.

Прыйшлі сюды будаўнікі восенню 1965 года. А ўжо сёння па ажурных каркасах жалезабетонных і металічных канструкцый угадваюцца контуры асноўных збудаванняў усіх вытворчасцей флагмана беларускай сінтэтыкі. Не сотнямі і не тысячамі квадратных метраў вымяраецца плошча некаторых з іх, а сотнямі тысяч. Ужо здадзены ў эксплуатацыю склады тэхналагічнага абсталявання і адміністрацыйны корпус. Выраслі карпусы цэха полімерызацыі, механічных вытворчасцей, штапельнага валакна, доследнай устаноўкі і іншых. У радзе цэхаў ідзе мантаж тэхналагічнага абсталявання. Эксперыментальная вытворчасць ужо ў гэтым годзе павінна ўвайсці ў строй.

Калі весці летапіс будоўлі, то абавязкова на яе першай старонцы трэба напісаць імя маладога інжынера А. Вазнясенскага. Ён першым прыйшоў сюды ў кастрычніку 1965 года і забіў першыя калкі. Працаваў прарабам, начальнікам участка, галоўным інжынерам упраўлення, а сёння ён — намеснік галоўнага інжынера трэста № 17 «Лаўсанбуд».

— На ўзбраенні нашага калектыву, — расказвае Аляксандр Сяргеевіч, — дзесяткі экскаватараў і бульдозераў, вежавых і перасоўных кранаў, сотні электраматораў і аўтамабіляў, мноства кампрэсараў і вібратараў, скрэперы і цягачоў, агрэгатаў для дахавых, аддзелачных і іншых работ.

Кіраўнікі трэста з асаблівай гордасцю называюць прозвішчы інжынераў Яўгенія Юрчанкі і Анатоля Клімовіча, Віктара Даніленкі і Анатоля Палякова, брыгадзіра слесараў Віктара Іванова.

А колькі герояў працы сярод мантажнікаў і бетоншчыкаў, муляраў і аддзелачнікаў, трубаўкладчыкаў і многіх іншых працаўнікоў будаўнічых прафесій! Калі пералічыць усіх перадавікоў вытворчасці, давялося б назваць сотні і нават тысячы людзей будтрэста № 17 і яго шматлікіх субпадрадных арганізацый, занятых на будаўніцтве Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна...

З такім жа натхненнем працуе калектыў другой ударнай новабудоўлі, анкету якой запоўнілі нам у будаўнічым трэсце № 13.

Імя: Бабруйскі шынны завод.

Год нараджэння: 1965.

Прадукцыя: пнеўматычныя шыны для Мінскага трактарнага, Мінскага, Жодзінскага і Магілёўскага аўтамабільных заводаў, Гомельскага, Бабруйскага і Лідскага заводаў сельгасмашын.

Тэхнічная аснашчанасць: ва ўсіх цэхах завода прадугледжваюцца прагрэсіўная тэхналогія, поўная механізацыя і аўтаматызацыя вытворчых працэсаў. Для аўтаматычнага кіравання вытворчасцю і яго рацыянальнай арганізацыі ў складзе завода прадугледжваюцца вылічальны цэнтр і агульны пульт апаратыўнага кіравання.

Як і ў Магілёве, будаўніцтва хімічнага гіганта ў Бабруйску суправаджаецца выканаццем вялікай праграмы жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва. Дастаткова сказаць, што абодва гарады атрымаюць у сувязі з будаўніцтвам новых гігантаў хіміі паўмільёна квадратных метраў жылой плошчы. Разам з жыллём узводзяцца студэнцкія гарадкі, бальніцы, дамы культуры, сталовыя, дзіцячыя ўстановы.

Яшчэ адна унікальная новабудоўля — Магілёўскі ліфтабудаўнічы завод. Каментарыі аб ім дае дырэктар новага прадпрыемства В. Іорын.

— Мы, будучыя эксплуатацыйнікі, задаволены тэмпамі будаўніцтва завода і ўпэўнены, што першую прадукцыю выпусцім ужо ў 1969 годзе. Перш за ўсё наладзім вытворчасць ліфтаў, прызначаных для дамоў не вышэй 16 паверхаў. Затым трэба будзе асвоіць ліфты для дамоў да 25, а пазней і — да 40 паверхаў. Да 1971 года прадпрыемства дасягне поўнай праектнай магутнасці — 10 тысяч пасажырскіх ліфтаў у год.

Мы расказалі толькі пра тры новабудоўлі. Акрамя іх, у вобласці ўзводзяцца новыя карпусы Магілёўскага аўтамабільнага завода, Асіповіцкага картонна-рубероіднага завода, Шклоўскага завода льнокастрыцавых пліт, Магілёўскага камбіната сілікатных вырабаў...

Г. БАРШЧЭЎСКІ.

⊙ ⊙ ⊙

Беларускі пісьменнік Мікола Гамолка нядаўна закончыў новую аповесць «Дзяўчына ішла па вайне». У ёй нічога не прыдумана, усё пададзена так, як было ў сапраўднасці. Ніжэй мы друкуем раздзелы з аповесці.

⊙ ⊙ ⊙

Мікола ГАМОЛКА

ДЗЯЎЧЫНА ІШЛА ПА ВАЙНЕ

СВЕТЛА і ціха было ў асеннім лесе. Дрэвы, скінуўшы на дол убранне, пад подыхам слабага ветрыка ледзь-ледзь пагойдвалі верхавінамі. Сямтам сярод голых галінак лёталі нейкія птушкі ды выбіваў сваю азбуку дзяцел.

Здалёк быў відаць кляновы гай. Куды ні кінь вокам, усюды шэрыя шурпатыя ствалы, толькі зрэдку трапляліся калматыя цёмна-зялёныя елачкі.

Нібы па зачараваным, казачна ўпрыгожаным дыване, ішлі мы з Надзеяй па рознакаляровым лісці.

Ззаду нас, тахкаючы коламі па замерзлых купінах, па карэннях дрэў, ехаў на падводзе наш бацька. Мы з сястрой выйшлі на ўскрай вялікага дрывасеку.

На ўзлессі, узняўшы ўверх магутныя карэнні, ляжаў стары дуплісты клён. Мабыць, не менш сотні год прастаяў ён тут, гэты магутны асілак, абараняючы сваёй разложыстай кронай маладыя зараснікі ад непагоды. Але, відаць, надышоў і яго час паміраць. Аслаблі чэпкія карэнні, не вытрымалі націску вятроў. Паваліўся асілак, адкрыўшы святло падрастаючаму пакаленню.

Бацька пад'ехаў, спыніў каня. Па-гаспадарску закінуў вяровачныя лейцы на куст арэшніку, падсунуў каню пад морду ахапак зялёнага духмянага сена.

— Вось, дзяўчаты, вам заданне: распілаваць гэтага асілка, — сказаў бацька, паказваючы на паваленае дрэва. — Дроў хопіць на ўсю зіму. Пачынайце, — падаў ён нам пілу, а я буду сякерай арудаваць. Дроў нарыхтуем хутка.

— А як жа, хутка! Ты, напэўна, забыўся, тата, што гэта — клён. Лепш пару елак зваліць або вунь тую старую асіну, тады б было хутка. Можа, так і зробім? — папрасіла я.

— Валі ўсё пад корань! Ламай, палі! Улады няма, усё спіша вайна. Так? — Бацька з дакорам глянуў на мяне. — А ты ведаеш, колькі год расце дрэва? Сто год! Прыйдуць нашы, а тут пуста... Разумець жа трэба!..

Ох, гэты бацька! Лепш не чапаць яго. Гатовы лекцыю прачытаць.

Я падала Надзі другі канец пілы, і мы ўзяліся за работу. Пілаваць клён было цяжка. Вострыя зубы з віскам уразаліся ў цвёрдую, як жалеза, драўніну. Але хіба нашага бацьку пераканаеш? Ён ніколі не сек на дровы жывое дрэва, заўсёды падбіраў паўгнілое галлё. Дровы ў печы гарэлі дрэнна, праз што ў бацькі з маці заўсёды ўзнікалі спрэчкі.

З частымі перадышкамі, адзін за другім пачалі мы адпілоўваць вялізныя круглякі. Бацька іх падхопліваў на рукі і складваў на воз.

Нарэшце падвода нагружана. Бацька туга ўвязаў дровы тоўстай вяроўкай, сабраў і кінуў пад куст недаедзенае канём сена, узяўся за лейцы.

Мы з Надзяй засталіся ў лесе. Нам трэба было падрыхтаваць дровы для чарговага рэйсу.

Бацька вярнуўся не скора. Ён доўга разварочваў воз, злосна пакрыкваў на каня. Потым дастаў з кішэні кісет з махоркай, скруціў цыгарку. Непаслухмянымі рукамі высек на трут іскру, прыкурыў. Зацягнуўшыся густым дымком, ціха сказаў:

— Та-ак, немцы...

— Што немцы?

— На пасёлку некалькі дзяўчат схапілі.

— Каго? — усклікнулі мы з Надзяй.

— Каго толкам, дзеці, не ведаю. — Ён спахмурнеў і замаўчаў. Потым, не гледзячы нас нас, рэзка кінуў: — Казаў жа вам, не будзем чакаць Сяргея Сцяпанавіча. Не паслухаліся...

Толькі к вечару вярнуліся мы з лесу дадому.

Прыціхлая, з заплаканымі вачыма сядзела маці на ляжанцы, прытуліўшыся спіной да цёплай печкі.

— Мам, каго ж? — наляцелі мы на яе.

— Ох, дачушкі, — маці выцірала фартухом слёзы, ледзь вымаўляючы словы. — Схапілі Лену, фельчарыцу, Тоню Стрэлаву, — яна ўсхліпнула, — хлопца нейкага з вёскі. Прыходзілі за Шурай, ды, на шчасце, яна не была дома. Схвалася. Што ж будзе цяпер? Што будзе?

— Чыіх? — адразу ж адказала сяброўка. — Ты яшчэ пытаеш, быццам не ведаеш! Рагалі гэта робяць. Адзін брат у паліцыі, другі — стараста. Вось і стараюцца.

Да дома Стрэлавых валіў народ. Ішлі групамі і ў адзіночку. Без слёз, без крыку. Але боль быў відаць на кожным твары. Яшчэ — нянавісць...

Па асеннім небе рэзкі вецер гнаў шэрыя валакністыя хмары. Час ад часу з іх сыпаліся сняжынкі, кружыліся і, дакрануўшыся да зямлі, таялі. Бабы, што тоўпіліся каля ганку Стрэлавых, захіналіся ў хусткі, зябка хавалі ў рукавы рукі. Мы з Галкай таксама тут. Працісну́ўшыся наперад, узыйшлі на ганак.

— Мама, супакойцеся. Можа іх адпусцяць...

— Ох, нічога ж вы, дачушкі, не ведаеце. Ды іх, бедненькіх, ужо і ў жывых няма. Пастралялі...

— Як?! — мы з Надзяй так і прыраслі да падлогі.

Нарэшце, першай знайшла ў сабе сілы загаварыць Надзя:

— Праўда, мама? Дзе?

— На бальшаку, — адказала маці, усхліпваючы. — Людзі чулі крыкі, стрэлы... Божухна, што ж будзе! Што будзе...

Вось і прыйшло тое, самае жудаснае...

Не распранаючыся і не сказаўшы нікому ні слова, я кінулася за парог. І хутчэй — да сяброўкі Галкі. Хто-хто, а яна павінна ведаць пра ўсё.

У вячэрніх прыцемках, без газоўкі, уся Галкіна сям'я сядзела на кухні. Цётка Фрося, трымаючы на руках маленькую ўнучку, трывожна паглядала ў акно.

— Дзе Галка?

— Вунь там, за комінам, — махнула рукой у бок печы сястра Тома.

Умомант я забралася на высокую печ. Галя тут. Ляжыць скурчыўшыся. Маўчыць, быццам не бачыць і не чуе, што каля яе апынулася я. Села ўзбоч сяброўкі, падабрала пад сябе азяблыя ногі.

Яркі квадрат святла, што пасылае месяц праз акно, цямнее. У паўзмроку Галін твар здаецца шэрым, падазрона блішчаць вочы.

— Дзе ты прападала цэлы дзень? Я да вас два разы забягала, — раптам загаварыла Галя, прыўзнімаючы галаву. — Тут такое рабілася...

— За што іх, дзяўчат?

— За што, за што! — зашаптала Галя. — Памятаеш, калі бульбу капалі, дзяўчаты з сякерай і пілой з лесу ішлі. Яны ж зямлянку там будавалі. Нашым, акружэнцам. А таго не ўлічылі, што іх бачылі не толькі мы. Немцы нездарма загады вывесілі і пагражаюць расстрэламі. — Галя цяжка ўздыхнула, зноў лягла на падушку.

— Галя, чыіх жа гэта рук справа?

— Балюча табе, дачушка? Скажы хоць слова, прыгажуня мая ненаглядная! Што ж ты маўчыш?

Глядзела ў вочы дачцы напружана і доўга, потым, азіраючыся на людзей, паўтарала:

— За што? За што забілі? Ты чуеш, дачушка, чуеш? Забілі яны цябе, забілі... Людзі, за што?

Трывожна ўзбунтаваўся ўвесь пасёлак. Ішлі і старыя і малыя. Ішлі школьныя таварышы загінуўшых, каб назаўсёды развітацца з імі. Плакалі мала. Сурова хмурылі бровы, глядзелі на забітых. Хіба слязам тут месца? Нянавісцю, абурэннем, гневам да фашыстаў поўніліся сэрцы людзей. Да здраднікаў, да ворагаў!

— Людзі, разыходзьцеся па хатах. Усім ісці на могілкі небяспечна. Наляцяць немцы, усім крышка будзе, — угаворваў баб старэнькі Амеля, спыняючы ля ганку падводу. — Развіталіся з бедалагамі, і царства ім нябеснае. Ідзіце дадому... Ідзіце, людзі...

Неахвотна разыходзіўся натоўп. Не было на гэтым пахаванні трун, не было белых саванаў, не было вянкоў, але кожны, хто прысутнічаў на ім, запомніў гэтае пахаванне на ўсё жыццё.

Моўчкі мы з Галяй вярталіся дадому. Няма больш дзяўчат. Забілі. Мы пакляліся адпомсціць. Адзін за адным у галаве ўзнікалі планы пакарання здрадніка. «Можа, дастаць з нашага «арсенала» вінтоўку, зрабіць засаду? А можа...»

Але думкі мае былі раптам перарваны. Мы пачулі бразгат шкла. Спыніліся. Насупраць дом, дзе жыве Нінка Возерава. Бачым, стаіць сяброўка ля акна і стукае ў шыбу.

— Зойдзем, — кіўнула я Галі.

— Ідзі сама, — адмовілася тая. — Потым раскажаш, чаго яна клікала. Добра?

Ніна сустрэла мяне ў сенцах у накінутай на галаву хустцы, у галошах на босую нагу, і тут жа папярэдзіла:

— Пачакай хвілінку. Я зараз вярнуся.

Не распранаючыся, я прысела на табурэтку каля кухоннага стала і мімаволі пачала разглядаць сцёрты ўзор старой цыраты.

— Чаго ты там сядзіш? Хадзі сюды, — паклікаў мяне са спальні Нінкін брат Міця.

Міця быў не адзін. На крэсле каля ляжанкі, апусціўшы галаву, сядзеў яго сябра Саня.

«Эх, як яго скруціла, — разглядаючы хлопца, падумала я. — Перажывае за Тоню. Яны ж сябравалі...»

— Хадзіла на пахаванне? — спытаў Міця.

— Была...

— Бачыла?

— У грудзях як агнём паліць... А гэтага паразіта рагатага павесіць і то мала...

— Правільна гаворыш, — пахваліў мяне Міця. — Здагадлівая... Паслухай, а ты не здрэйфіш у адной справе?

Міця, нібы бачачы ўпершыню, упіўся ў мяне позіркам.

— Наогул, вы з Нінай задзіры заядлыя... Але тут патрэбна адвага, вытрымка... Разумееш?

— Кажы, што трэба зрабіць.

— Ух ты, быстрая якая! А не спалохаешся? Ды і язык трымаць трэба за зубамі.

У сенцах на дзвярах бразнула клямка. Нехта прыйшоў. Ага, вярнулася Ніна. Яна, як кошка, ускочыла на печку і, звесіўшыся цераз край, паведаміла хлопцам:

— Дома яго няма. А наогул, навошта збіраць натоўп, хопіць і нас, чатырох.

«Пра што гэта яны? — усаджваючыся побач з Міцем, думала я. — Штосьці прыдумалі, мяне ўключылі».

І, гордая даверам хлопцаў, уважліва стала прыслухоўвацца да размовы.

— Слухай, — раптам прашаптаў мне Міця, — ты зможаш заўтра адлучыцца на паўдзянька з дому?

— Чаму ж не?

— Вось і добра. Значыць, ты вольная. Забіраем і цябе. Але адна ўмова, — папярэдзіў Міця, — каб ніхто нас не бачыў. Мы, — тлумачыў ён далей, — надумалі пайсці на бальшак. Вы з Нінай будзеце стаяць на варце, а мы з ім, — і ён кіўнуў на Саню, — сёе-тое падкладзём на дарозе...

— Чаму ж на дарозе? А не пад дом Рагаля? — запярэчыла Ніна.

— Рагаля пакуль чапаць нельга. За гэта дзярмо могуць людзі паплаціцца... Але мы і яму нешта падрыхтавалі...

— Не, — не згаджалася з братам сястра, — калі яму не даць па руках зараз, за дзяўчат, ён такога нарабіць можа, што потым не расхлябаем усім пасёлкам. Няхай, гад, ведае, што і яму не ўсё дазволена...

— Ну, чаго ты гарачышся! — абарваў яе брат. — Дагаварыліся ж, ёй вось даверыліся, — паказаў ён на мяне. — Падумайце, пакуль не позна. Каб на месцы не разгубіліся. А то нас падвядзеце і справу ўсю загубім.

Мне было крыўдна. За каго хлопцы нас лічаць? Колькі перасцярогі, колькі папярэджанняў. А патрабуецца ад нас з Нінай толькі пастаяць за дазорцаў. Хто-хто, а мы не з баязлівых...

Назаўтра раніцой усе мы, чацвёра, сабраліся ва ўмоўленым месцы. Саня асцярожна нёс у мяшэчку нешта цяжкае востраканечнае. Абыходзячы хмызняком высечаныя дзялянкі і гароды, мы накіраваліся ў бок бальшака. Да намечанага месца трэба было прайсці кіламетраў восем, далей ад пасёлка, каб менш на нас падала падазрэнняў.

Ішлі моўчкі, пільна глядзелі, каб не трапіць камунебудзь на вочы. Зрэзаўшы вялікі вугал, лесам выйшлі на бальшак Жлобін — Рагачоў. Доўга выбіралі для сваёй нескладанай дыверсіі падыходзячае месца. Нарэшце, у невялікім лажку, што зарос густым ельнікам, спыніліся. Калючыя зараснікі маладых елачак выбягалі да самай дарогі. Метраў дваццаць, не больш, было паміж імі і каляінай.

— Вось тут і спынімся, — як старэйшы, заявіў Саня. — Ты, — паказаў ён на мяне, — ідзі ў бок Жлобіна. Метраў на сто, на сто пяцьдзесят. А ты, — звярнуўся тут жа да Ніны, — руш ў процілеглы бок. Майце на ўвазе, дзяўчаткі, на вас уся надзея...

ВОЧЫ АДКРЫЛІ ПРАЎДУ

Некалькі тыдняў гасцяваў на Мастоўшчыне ў сваіх родных Іван Паўлавіч Ганчарук. Прыехаў ён са Злучаных Штатаў Амерыкі. Больш як 50 гадоў не быў гэты чалавек на роднай зямлі.

Амаль усё свядомае жыццё знаходзіўся Іван Паўлавіч у ЗША. За многія гады яму не раз прыходзілася слухаць розныя небыліцы пра рускіх людзей і ўладу Саветаў. Буржуазная прапаганда і зараз нясе несусветную хлусню пра Савецкую краіну. Перад ад'ездам у СССР І. Ганчарук чуў ад нашых ворагаў, напрыклад, такія размовы. Бальшавікі, маўляў, давялі краіну да галоты. Там мала хто мае нават чаравікі. Людзі жывуць паўгалодныя.

На зямлі сваіх бацькоў Іван Паўлавіч убачыў радасныя перамены. У Мастах, у Нацкава, у іншых месцах людзі жывуць заможна. І, вядома, маюць не толькі чаравікі, але і апошніх мадэлей туфлі, прыгожае адзенне, дастатак харчавання. Іван Паўлавіч прыгадаў, як яго маці сляпіла вочы і абразала пальцы, прадучы пры лучыне кудзелю. А зараз кросны і іншыя прылады хіба толькі сустрэнеш у музеі.

Госць з Амерыкі прызнае, што ў ЗША больш машын, лепшыя дарогі. Але ж Амерыка ніколі не ведала такіх войнаў і разбурэнняў, як савецкія людзі!

Ды і няма чаго ўжо хваліцца амерыканцам тымі машынамі. Пляменнік Івана Паўлавіча — Васіль працуе на шчучынскім заводзе «Аўтапровад» і мае ўласную легкавую аўтамашыну. Легкавыя аўтамабілі ўсё часцей купляюць грамадзяне СССР — рабочыя, служачыя, калгаснікі.

А вось другі факт. Нядаўна сваякі развіталіся з Р. Крупіцам, які жыве па суседству з І. Ганчаруком у Нью-Йорку. Дык родзічы выклікалі ў вёску заказны аўтобус і на ім праводзілі Грыгорыя аж у Гродна.

Наш карэспандэнт спытаў у Івана Паўлавіча пра яго адносіны да вайны ў В'етнаме, да дзейнасці антысавецкіх эмігрантаў. Субяседнік прывёў такую лічбу. З 100 зароблены амерыканскім рабочым долараў 35 ідзе на ваенны падатак. Адным словам, улады ЗША душаць працоўных падаткамі. Вайну ў В'етнаме многія праклінаюць. Эмігранты рускага, беларускага і іншага паходжання з агіднасцю адносяцца да ўцёкшых за акіян нямецкіх прыслужнікаў. Людзі, якія не забылі пра сваю вялікую Радзіму, гавораць яе здраднікам: «Мы не будзем чысціць вашыя боты!».

А. ДУБРОЎСКІ.



Казахская ССР. Непадалёку ад маладога горада Ярмак будуецца ДРЭС магутнасцю 2 мільёны 400 тысяч кілават. У гэтым годзе яна дасць прамысловы ток. НА ЗДЫМКУ: на будаўніцтве Ермакоўскай ДРЭС.

Фота К. НУРТАЗІНА.

●

Кіеўская вобласць. Магутны рокат матораў разносіцца над вопытнымі палямі Украінскай машынавыпрабавальнай станцыі «Сельгастэхнікі»; новыя машыны здаюць экзамены на трываласць, надзейнасць, эфектыўнасць, скорасць... Перш чым новы камбайн або сеялка атрымаюць пуцёўку ў масавую вытворчасць, ім трэба за некалькі месяцаў прайсці 6—8-гадовы цыкл работы. Пры дапамозе сучасных прыбораў, апаратаў, стэндаў, якімі аснашчана станцыя, выпрабавальнікі даюць дакладную ацэнку новай машыне. НА ЗДЫМКУ: пры дапамозе тэнзаметрычнай перасоўнай лабараторыі правяраюць сілавыя параметры трактара і навясной сеялкі УСМС-5,4.

Фота А. ПАДДУБНАГА.

РАДУЕ РОДНЫ КРАЙ

Апошні раз я быў у Шасцілах пры буржуазнай Польшчы ў 1932 годзе. І вось зноў я ў роднай вёсцы. Як змянілася тут жыццё! Калі ў той час беларусы былі бяспраўныя, іх называлі быдлам, то зараз мае землякі сталі гаспадарамі свайго жыцця. Навокал дастатак і культура: багацце прадуктаў, электрычнасць, радыё і тэлебачанне, клубы.

Радасна, што дзеці сялян атрымліваюць адукацыю ва універсітэтах і інстытутах. Мая ўнучка стала настаўніцай, сын пляменніка — лесатэхнікам. У нас навучанне і лячэнне вельмі дарагія. Каб зрабіць аперацыю апендыцыта, трэба заплаціць 300—500 долараў. Дзень знаходжання ў бальніцы каштуе 20 долараў. Савецкія ж людзі не маюць нават уяўлення аб аплаце за лячэнне ці адукацыю.

У Амерыцы я не ведаў добрага жыцця, прыходзілася і галадаць. Толькі ў час другой сусветнай вайны, калі капіталісты сталі атрымліваць вялікія барышы, стала большай зарплата і рабочым. Але зароблены на ваенных заказах хлеб не кожнаму лезе ў горла. Аднак правячыя колы ЗША і зараз карыстаюцца гэтым, у дні вайны ў В'етнаме. Урадавая прапаганда крычыць аб дабрабыце рабочых, забываючы пра нязінныя ахвяры з ліку простых людзей.

Сумленныя людзі ЗША разумеюць падман урада і патрабуюць спыніць вайну ў В'етнаме, называюць яе ганебнай і бруднай. Мне, як і іншым амерыканцам, сорам за амерыканскі вобраз жыцця. І тым больш я ганаруся Савецкім Саюзам — радзімай маіх бацькоў і дзядоў.

Рыгор КРУПІЦА,
грамадзянін ЗША.

ПЕРАКЛАДЗЕНА НА АНГЛІЙСКУЮ МОВУ

У пачатку мая ў Мінску адбывалася III Усесаюзная нарада па цепла- і масаабмену. Аб тым, якое значэнне надалі яго рабоце за рубяжом, сведчыць пасылка, якая прыбыла днямі ў адрас Інстытута цепла- і масаабмену Акадэміі навук БССР. У гэтай пасылцы ўсе сем тамоў матэрыялаў нарады, якія выдадзены на англійскай мове ў ЗША.



Дары восені.

Фота А. СТЭЦА.

ДУХОЎНАЕ ЖАБРАЦТВА

Нядаўна ў Драгічын прыйшло пісьмо з Аўстраліі, адрасаванае: «Дом міліцыі. Пану следчаму». Незвычайнае гэта пісьмо. Прыслала яго Ядвіга Серацінская. Летась, праз 25 год разлукі, яна змагла наведаць родныя мясціны, убачыць наша жыццё.

Вось урывак з яе пісьма:

«Паважаны грамадзянін, маё знаходжанне на Радзіме, у родных мясцінах прынесла мне вялікую радасць у жыцці, паколькі ўсё змянілася, паўсюдна новабудоўлі, што я не магла пазнаць родныя мясціны з гэтымі квітнеючымі вялікімі садамі, светлымі хатамі. А як наш народ жыве весела і шчасліва на роднай святой зямлі! Ва ўсіх сады, у кожнай вёсцы электрычнасць, радыё, школы, магазіны. І я ўбачыла народ свой, які ён шчыры, ветлівы, гасцінны і вясёлы, што такога ў свеце няма. А родныя песні, якія гучаць на родных палях! Яны ў маіх вушах да гэтага часу гучаць.

Я ўбачыла Радзіму, убачыла, як усе жывуць шчасліва і весела. А мая малодшая сястра Ніна Сямёнаўна Янусік усё пісала мне, што там голад, што немагчыма пражыць, і ўсё прасіла, каб ёй пасылалі пасылкі, таму што няма чаго есці».

Шчыра кажучы, не паверыў, не мог паверыць я другой частцы гэтага пісьма. Цяжка ўявіць сабе, што такую нахабную хлусню магла напісаць грамадзянка нашай краіны. Відаць, аўстралійская падданая таксама прадбачыла, што яе паведамленне аб паводзінах сваячкі выклікае здзіўленне ў суайчыннікаў, і яна паклала ў канверт некалькі пісьмаў сястры. З цяжкасцю можна разабраць каракулі. Складаецца ўражанне, што пісаў іх чалавек, які не прайшоў і лікбезу.

У сапраўднасці гэта не так. Ніна Сямёнаўна Янусік мае сярэднюю адукацыю плюс дыплом бібліятэчнага тэхнікума, загадвае сельскім клубам у Хомску.

Але звернемся да яе слязлівых пісьмаў за акіян. У адным з іх Янусік пісала:

«А ты ўсё пішаш, пакінь Хомск, ідзі да бацькі. І што там? Глядзець, каб той мех бульбы, што ёсць у бацькі, з'есці, а потым і бацька галодны і я...»

Звернемся да фактаў, паслухаем людзей, сярод якіх жыла вымагацелька. Калі жыхары Хомска даведаліся аб ганебным учынку Янусік, абурэнню іх не было межаў.

Перапоўненая зала сельскага клуба абуралася. У сваіх выступленнях працаўнікі мясцовага калгаса гнеўна асуджалі Янусік, далі дастойную ацэнку яе пісьмам у двух словах: паклёп, агіда. Людзі гаварылі аб тым, аб чым яна ўмоўчвала, аб чым не напісала ў Аўстралію. А жыхарам гэтай вялікай прыгожай вёскі ёсць чым ганарыцца, ёсць аб чым расказаць, паказаць прыезджым. Ды ў гэтым увачавідкі пераканалася сама госця з Аўстраліі. На вуліцах Хомска выраслі прыгожыя дамы, будынак сярэдняй школы, ёсць клуб, бібліятэка, чайная, тры магазіны, хлебапякарня, дзве майстэрні бытавога абслугоўвання, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт. Уздымаюцца сцены новага палаца культуры.

Не напісала Янусік за граніцу і аб тым, як расквітнеў мясцовы калгас імя Кірава, што людзі нядрэнна зарабляюць, багата жывуць.

Ну, а які ж яе асабісты дабрабыт? Можа, на фоне іншых яна сапраўды жыве ў галечы? Давайце прыкінем. Жыве яна ў дзяржаўнай кватэры, бясплатна карыстаецца электраэнергіяй, бясплатна атрымлівае паліва на зіму, прычым падвозяць яго да самага дома, мае вялікі прысядзібны ўчастак. Атрымлівае 67 рублёў у месяц зарплаты, ды і муж, які загадвае сепаратарным аддзяленнем, — не меней.

А як жа бацька, з якім яна разам «галадала»? Не напісала ж Янусік, што ён атрымлівае дзяржаўную пенсію, мае вялікі пладаносячы сад, што побач са старым домам вырас ужо новы зруб.

Факты, як бачыце, абвяргаюць вымыслы папрашайкі. Чаму ж усё-такі Ніна Янусік прыкідваецца гэткай «вялікамучаніцай»? Адказ просты: страціў чалавек гонар, апусціўся да ўзроўню маральнага падонка. Складаючы свае пісьмы за акіян, Янусік думала толькі аб адным: выпрасіць падачку, атрымаць хаця б некалькі стракатых заморскіх анучаў, якія затым паспрабаваць загнаць на рынку. Такія вось наскрозь хлуслівыя пісьмы звычайна выкарыстоўваюць нашы непрыяцелі ў антысавецкай прапагандзе.

Дзеля нажывы Янусік гатова была ўзвесці паклёп на ўсё, самае роднае і блізкае. Вось яшчэ ўзор яе пісаніны:

«Чужыя прыходзяць, а свае гады (г. зн. родзічы. — П. С.) забылі. Гэта ж усе злосныя, чаму бацька і маці не аддаюць ім усё тое, што вы прысылаеце».

І ў другім месцы:

«Наконт цётак Ярыны і іх усіх, то гэта звяры бяздушныя».

Вось так, дарагія цётачкі і дзядзечкі. Не хочаце пазалаціць ручку — зняславіць на ўвесь белы свет. Нават за трыдзевяць зямель даведаюцца аб вашым «бяздушшы». А сама, бач ты, разжаліць заграніччых родзічаў, і яны вышлюць пасылачку.

І тыя верылі, пасылалі. Вось што піша сястра з Аўстраліі:

«Мы тут, у Аўстраліі або Амерыцы, вельмі цяжка працуем, і паколькі сястра Ніна апісвала, што на радзіме такая бяда, то мы пасылалі для бацькі і памёршай маці. А як я прыехала на радзіму і ўсё ўбачыла, аказалася, што яны нічога не носяць гэтага, а сястра Ніна ўсё прадае на гарэлку для свайго палюбоўніка і на аліменты».

І гэта праўда. На сходзе аднавяскоўцы з абурэннем гаварылі аб маральным аблічча Янусік.

Апусцілася Ніна Янусік. Дом ёй прадаставілі нядрэнны, але цяпер у яго і зайсці непрыемна. Бруд, беспарадак, быццам пасля землетрасення.

«Аўтобуса не будзе, то на работу спозніцца, выкінуць з работы».

Калі зачыталі гэтыя словы, зала дружна зарагатала. А камсамолка Валя Галах сказала:

— Гэта ж не культработнік, а гора адно. Яна сваёй грубасцю, абыякавасцю да працы адбіла ў моладзі ахвоту ў клуб заходзіць. На рэпетыцыі не з'яўлялася, самі шукалі яе, каб ключ узяць. А вось плёткі разносіць яна майстар. Даўно ўжо трэба было гнаць яе з работы.

Зала апладзіруе.

Яе спрабавалі выхоўваць, крытыкавалі, але на рабоце трымалі. Проста шкадавалі. Але яна наплявала на ўсё тое добрае, што для яе рабілі.

Нашы людзі ганарацца тым, што жывуць у свабоднай і шчаслівай краіне, што сваёй працай упрыгожваюць нашу зямлю.

І калі сустракаюцца ў нашай вялікай сям'і духоўныя калекі, якія дзеля заморскай стракатай анучы гатовы паклёпнічаць на свой дом, ім наша агульная пагарда.

П. СУЦЬКО.

«Зара», Брэст.

ВЫДАТНЫ МУЗЫКАНТ СУЧАСНАСЦІ

Днямі ў рэспубліцы адбыўся фестываль лаўрэатаў міжнародных і ўсесаюзных конкурсаў. З выдатнымі савецкімі дырыжорамі і музыкантамі сустрэліся не толькі мінчане, але і аматары музыкі іншых вялікіх і малых гарадоў і вёсак. У фестывалі прынялі ўдзел славутыя выканаўцы, чые імёны сёння вядомы ва ўсім свеце. На нашых здымках: піяністы Элісо ВІРСАЛАДЗЕ і Раман НОДЭЛЬ, дырыжор Віталій КАТАЕЎ; справа — выступленне Дзяржаўнай харавой капэлы БССР пад кіраўніцтвам Р. Шырмы.

Леў АБОРЫН,
прафесар, народны артыст СССР

Галавой савецкай скрыпічнай школы музыканты па праву называюць лаўрэата Ленінскай прэміі, народнага артыста СССР Давіда Ойстраха. Сапраўды, больш чым саракагадовая выдатная канцэртная дзейнасць Давіда Ойстраха па гарадах Савецкага Саюза, гастролі ў многіх краінах свету замацавалі за ім славу аднаго з буйнейшых музыкантаў сучаснасці.

Выключнае музычнае дараванне Давіда Ойстраха выявілася ўжо ў пяцігадовым узросце, і ён стаў вучнем вядомага педагога Пятра Сталярскага. А ў 1926 годзе, калі на выпускным экзамене Адэскай кансерваторыі на эстраду выйшаў малады Ойстрах, стала зразумелым, што з'явіўся новы вялікі музыкант.

«Высокаталенавітаму маладому віртуозу — мастаку і выдатнаму музыканту Давіду Ойстраху ў памяць аб нашых сумесных канцэртных выступленнях на Украіне. Шчыра адданы паклоннік яго дараванння А. Глазуноў».

Такі даравальны надпіс на сваім партрэце зрабіў у 1927 годзе Аляксандр Глазуноў, рускі кампазітар, які высока ацаніў талент дзевятнаццацігадовага музыканта.

Мне хочацца ўспомніць некалькі эпізодаў з творчага жыцця Давіда Ойстраха, якія ярка паказваюць, як услед за прызнаннем яго мастацтва ў Савецкай краіне ён заваёўваў прызнанне і зарубежных слухачоў. У 1935 годзе мы прымалі ўдзел у першай зарубежнай гастрольнай паездцы савецкіх артыстаў у Турцыю. Сорак пяць дзён з вялікім поспехам выступалі савецкія дзеячы мастацтва ў Анкары, Стамбуле і іншых гарадах.

Давід Ойстрах меў вялікі поспех як сталы буйны музыкант. Па просьбе членаў турэцкага ўрада Давід Ойстрах і я ўпершыню выканалі санату Грыга. Гэта выступленне паклала пачатак нашай шматгадовай творчай садружнасці ў выкананні камернай музыкі.

З году ў год расло і ўдасканальвалася майстэрства выканання Давіда Ойстраха. У трыццатых гадах ён атрымаў выдатную перамогу на Усесаюзным конкурсе музыкантаў-выканаўцаў у Ленінградзе, а таксама на міжнародных конкурсах скрыпачоў у Варшаве і Бруселі.

...Лета 1953 года. У Парыжы адбыўся Міжнародны конкурс скрыпачоў і піяністаў імя Жака Цібо і Маргарыты Лонг. Трэба было бачыць, які гарачы прыём аказалі парыжане Давіду Ойстраху, які ў сольным канцэрце ў суправаджэнні аркестра пад кіраўніцтвам Цібо і Разенталя віртуозна выканаў тры скрыпічныя канцэрты — Моцарта, Брамса і Хачатурана.

«Найвялікшы скрыпач сучаснасці», «Мацнейшы з моцных», «Маскоўскі Паганіні», «Натхняльнасць і дасканаласць мастацтва» — такімі выдатнымі характарыстыкамі былі поўныя рэцэнзіі французскіх газет.

Польшча, Чэхаславакія, Венгрыя, Румынія, Аўстрыя, Францыя, Англія, Бельгія, Фінляндыя, Швецыя, Галандыя, Японія Злучаныя Штаты Амерыкі, Лацінская Амерыка... — ва ўсіх канцэртных залах краін свету слухачы бурна віталі выступленні праслаўленага савецкага скрыпача.

Што характарызуе Давіда Ойстраха як музыканта?

Стыль яго выканання вызначаецца вялікай праўдзівасцю і натуральнасцю, віртуознасцю ігры, бліскучай тэхнікай, беззаганнасцю інтанацыі. Гэта музыкант велізарнай патрабавальнасці да сваёй творчасці, які няспынна ўдасканальвае сваё выканаўчае майстэрства. Грандыёзны яго рэпертуар — ад класікі да сучасных аўтараў. Давід Ойстрах выдатна іграе Бетховена і Баха, Моцарта і Брамса, Чайкоўскага і Рахманінава, Сібеліуса і Стравінскага. Вялікая заслуга скрыпача ў прапагандзе твораў савецкіх кампазітараў: Пракоф'ева, Мяскоўскага, Шастаковіча, Хачатурана, Кабалеўскага і іншых.

Трэба сказаць, што Давід Ойстрах — шматгранны музыкант. Ён выдатны дырыжор. Падзеяй у музычным жыцці з'явіліся яго выступленні як дырыжора. У яго рэпертуары творы Брамса, Берліоза, Шуберта, Малера і іншых аўтараў. А ў бліжэйшы час ён выступіць у Маскве як дырыжор з выкананнем Шостай сімфоніі Чайкоўскага.

Давід Ойстрах і выдатны педагог. У Маскоўскай кансерваторыі я з цікавасцю назіраю за яго педагагічнай дзейнасцю. Ён выхаваў плеяду ўжо вядомых маладых таленавітых скрыпачоў: Валерыя Клімава, Ігара Ойстраха, Віктара Пікайзена, Розу Файн, Ольгу Каверзневу і многіх іншых.

Сваё шасцідзесяцігоддзе Давід Ойстрах сустракае ў росквіце творчых сіл. Ён паспяхова працуе над новымі творамі. Нядаўна ён выступіў на Венскім музычным фестывалі як дырыжор, выязджаў на канцэрты ў Англію.

АДН.

«ПЕСНЯ АБ ГАЙАВАЦЕ» НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Паэма «Песня аб Гайаваце» Генры Лангфела ўпершыню прагучала на беларускай мове. Яе пераклад, зроблены таленавітым майстрам паэтычнага слова Аркадзем Куляшовым, вызначаецца вялікім майстэрствам і цудоўна перадае своеасаблівасць і стыль арыгінала. Перакладчыка, як ён указвае ў прадмове, прыцягнулі рамантычны эпас класічнага твору, які прапаведуе мір і дружбу паміж людзьмі.

«Песня аб Гайаваце» ў перакладзе А. Куляшова ў наступным годзе выйдзе асобнай кнігай у выдавецтве «Беларусь».

ПЯЦІТОМНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Выданне пяцітомнай гісторыі Беларусі ўпершыню пачала Акадэмія навук Беларускай ССР. Падрыхтаван да друку першы том, заканчваецца рэдагаванне другога.

Тры тамы з пяці будуць прысвечаны гісторыі беларускага народа ў савецкі перыяд. Адзін з іх цалкам прысвячаецца ўдзелу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

ЗАПРАШАЕ БІБЛІЯТЭКА «ЮНАЦТВА»

20.500 — столькі бібліятэк працуе ў Беларусі. Да паслуг чытачоў рэспублікі 75 мільёнаў тамоў. Шмат бібліятэк у нашай сталіцы — Дзяржаўная бібліятэка імя Ул. Леніна, бібліятэка імя Я. Купалы, імя Л. Талстога, імя А. Чэхава і г. д.

Вялікай папулярнасцю ў маладых мінчан — рабочых, студэнтаў, школьнікаў карыстаецца гарадская бібліятэка «Юнацтва». Тут чытачы заўсёды могуць атрымаць параду наконт той ці іншай літаратуры, паслухаць агляды новых кніг ці часопісаў, якія праводзяцца штомесяц.

У бібліятэцы рэгулярна наладжваюцца тэматычныя выстаўкі кніг (зараз, напрыклад, падрыхтавана выстаўка «Беларускаму раману 50 год»), літаратурныя вечары, канферэнцыі, дыспуты. У госці да чытачоў «Юнацтва» часта прыходзяць беларускія паэты, празаікі, драматургі, кампазітары і музыканты. Гэтыя сустрэчы арганізуе «Клуб мастацтваў».

Але вечары і дыспуты праходзяць не толькі ў залах бібліятэкі. Яны выходзяць за яе межы. Цікавая гутарка на тэму «Моладзь Беларусі ў гады Айчыннай вайны ў мастацкай літаратуры» адбылася нядаўна ў гарадскім парку імя Чалюскінцаў.

Т. ХОХА,
Л. ВАНЧУКЕВІЧ,
студэнткі БДУ імя Леніна.

ВЕРШЫ

Пятро ГАРЭЦКІ.

Купала на Тарасавай гары

Дняпро і кручы... Канева дубы...
Яны стаяць не проста, як акраса,
Яны, як сведкі цяжкай барацьбы,
Людскога гора, цемры і журбы,
Што увайшлі ў радкі пякучыя Тараса.
Дняпро і кручы... У роднай старане
Сады вішнёвыя ля белых хатаў...
І прыгадалася спатканне мне,
І прыгадаўся год трыццаць дзевяты.
...Яшчэ гарэла раніцай зара,
Святло па небе ясным разлівала,
Як на паклон да бацькі Кабзара
Прыйшоў пясняр — праслаўлены Купала.
Стаяў Купала ў роздуме.
Ляглі
Маршчынкі на ягоны воблік мілы.
І грудачку свяшчэннае зямлі
Паклаў ён на паэтаву магілу.
Прайшлі гады. Плыве Дняпро пявучы,
Раве ў плацінах глыбамі вады,
І назаўжды на Канеўскай той кручы
Купалавы адбіліся сляды.

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

У партызанскім лесе

Трасуць бярозы ўпартай грывай
І сосны у блакіт—
Стралой.
Зязюлі, быццам вартавыя,
Пераклікаюцца паміж сабой.
Я замарудзіў крок, суцішыў,
Успамінаю,
А наўкол,
Нібы лімонкі, рвуцца
шышкі,
З галін сарваўшыся на дол.
Ступіў далей —
І нечакана,
Бы папярэджваў ён пасты, —
Яловы сук на ўсю паляну
Пад ботам стрэльнуў...
Як тады,
Сурова сосны пазіраюць:
Ці свой я!
Што за чалавек!
Вось-вось, здаецца, не стрываюць:
«Хто йдзе!»—
Рашуча запытаюць.
І я ім адкажу:
— Свае!

Новы палац культуры пабудаваны ў саўгасе «Мухавец» Брэсцкага раёна.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

ЛИТЕРАТУРА И СОВРЕМЕННЫЙ МИР

В Ташкенте, в столице Советского Узбекистана, писатели стран Азии, Африки, Советского Союза, гости с разных континентов нашей планеты держали большой совет о проблемах литературы, культуры в современном, столь сложном и своеобразном мире.

Прошло всего десять лет после первой Ташкентской конференции писателей стран Азии и Африки. Срок, с точки зрения масштабов истории, прямо скажем, не очень большой. Но едва ли можно обычными, пока еще привычными мерками, производить отсчет времени нашего века, века начала краха империализма, пролетарских революций, гигантского подъема национально-освободительного движения народов, разорвавшего оковы создававшейся веками сложной системы колониализма.

Национально - освободительное движение за это памятное десятилетие проделало большой путь развития. Колониальная система политического господства империализма разрушена. На великих просторах Азии и Африки образовались новые молодые государства. Победа далась в длительной борьбе, в результате разгрома фашизма, победы во второй мировой войне Советского Союза и стран, воевавших вместе с нами в ту пору, когда над миром нависла страшная опасность разрушения цивилизации, культуры, создаваемой народами в продолжении веков. Борьба продолжается в португальских колониях, народы Латинской Америки напрягают силы, чтобы сбросить ярмо экономического, идеологического давления империализма Соединенных Штатов Америки.

Последние три десятилетия этого века ставят новые проблемы перед народами Азии, Африки, Латинской Америки.

Сейчас империалисты создают свои пункты в Азии, Африке, например, родезийский плацдарм, как точки, откуда можно будет вести наступление на молодые государства этого континента. Стимулируют процессы, которые мешают развитию в странах Африки, Азии прогрессивных социальных структур. Ведут вооруженную борьбу за упрочение позиции империализма в Юго-Восточной Азии. Именно решению этой задачи служит грязная война, развязанная США во Вьетнаме, агрессия Израиля против стран Восточного Средиземноморья.

Сейчас империалисты не жалеют десятки миллионов долларов для своей неоколониалистской политики экономического, политического проникновения, идеологического наступления, насаждения трайболизма в развивающихся странах, для «культуртрегерской» работы в бывших колониях. Они учреждают университеты, колледжи, конфессиональные школы. К примеру, пропагандистский аппарат ФРГ учреждает там «культурные центры» «Института имени Гёте», и мне во многих странах Африки пришлось знакомиться с работой этих центров, где «культура» поразительно замаскированно переплетается с прямой идеологической диверсией. Всеми такого рода средствами и методами империалисты пытаются держать в сфере своего влияния бывшие свои колонии.

Нельзя забывать, что в Азии, Африке, в некоторых странах Латинской Америки царствует стихия безграмотности, беспросветная нищета, которые создают основы для безумств «культурной революции», проповеди разных вариантов «уравнительного общества», субъективизма в политике, желания немедленного решения вопросов, которые требуют определенного времени, трезвой оценки ситуации, а не эмоциональных взрывов, которые в конечном счете рождают очень опасный авантюризм.

Дают о себе знать социальные классовые противоречия, которые рождаются уже на почве вновь возникших национальных африканских, азиатских государств. Будущее нации зависит теперь от того, кто будет держать в руках национальное знамя в экономической, политической независимости народа, сумеют ли трудящиеся классы этих стран направлять жизнь нации, ее духовное развитие, организовать бьющую ключом разбуженную энергию народов.

Сложно стоят проблемы структуры культуры развивающихся стран. Проблема языка, соотношения национального и интернационального, традиции и понимания новых проблем жизни, новых форм видения этих проблем, соотношения родоплеменных народных представлений с современным уровнем восприятия, анализа, понимания, отображения проблем, которые ставит новая эпоха.

В некоторых странах Африки и Азии возникла очень не простая проблема, если можно так выразиться, разноязычности одной части интеллектуальной элиты и широких масс народа. Во многих случаях эта элита в основном думает, говорит, выражает свои мысли, чувства на английском, французском, немецком языках (известный поэт и критик, представляющий Берег Слоновой Кости, пишет, что это язык «интеллигенции и чиновничества»), а широкие слои народа — на национальном, родо-племенном языке, диалекте, языке народности.

Дело не только в языке. Некоторая часть интеллигенции стран Азии, Африки вжилась в английскую, французскую культуру. Культура родо-племенных этнических образований своих народов только-только ощутимо, зримо входит в их творчество, в их миропонимание, мироощущение. С другой стороны, другая часть деятелей литературы, культуры связывает себя с рамками своего клана, рода, племени. Нам кажется правильным определение задачи писателя стран Азии и Африки, высказанное сенегальским романистом Сембен Усманом. Он писал недавно: «...человек Африки, постепенно вступающий в свою эпоху, вынужден расстаться с тесными рамками своего племени. Для каждого африканского деятеля культуры положение его народа, чаяния миллионов людей есть дело первостепенной важности. Говорить о литературе и искусстве — значит говорить о людях, значит помогать своему народу идти к взаимопониманию с другими народами».

В результате империалистического проникновения в экономику, культуру ряда стран появилась определенная прослойка интеллигенции, которая, выступая на словах якобы «за полную свободу творчества», по существу, иногда сама того не ведая, уходит от насущных задач, которые стоят перед их народами.

Перед писателями стран Азии и Африки стоят и просветительские функции. Снобизм им ни к чему. Что есть писатель без своего народа? Ничто. Что есть народ, у которого нет современных, основанных на признанной системе ценностей, культуры, литературы, искусства. Этот народ уже не субъект, не творец своей судьбы, своей истории, он легко может потерять ориентацию в этом сложном мире, впустую растратить свою энергию, свои возможности, которые глубоко заложены в недрах народных масс.

Было бы неправильно судить о сложнейших проблемах строительства культуры в Азии, Африке, странах Латинской Америки недифференцированно, представляя эти страны как нечто однообразное. Ведь в Азии находится и арабские страны со своей имеющей большие исторические традиции арабской культурой. Тут же Китай, Индия, Пакистан, Афганистан, Япония, Индонезия, Африка — это мозаика культур, языков, разных ступеней развития общественных структур, разных идеологий, представлений о природе, человеке...

На данном этапе развития стран Азии и Африки для определения задач их культурного строительства только лишь географические координаты — недостаточный критерий. Наступила пора выполнить эти задачи хотя бы по группам стран, не говоря уже об отдельных странах, не впадая, конечно, в другую крайность — не к чему игнорировать общие закономерности, характерные для стран «третьего мира».

Все эти сложнейшие задачи будут решаться в процессе формирования, становления, укрепления прогрессивных наций в Азии, Африке, их экономической, территориальной, языковой, культурной организации. Для этого нужен определенный исторический срок, даже в условиях убыстрения темпа общественного процесса. Их решит время и, возможно, разно в разных странах. Незачем, конечно, упрощать сложную мозаику жизни, сводить решение возникающих национальных и иных коллизий к их однозначному решению. В этом деле не существует стандартов мер и весов, главное, чтобы эти процессы направлялись людьми доброй воли и прогрессивных мировоззренческих позиций, для которых святы интересы самых широких масс народа.

Счастье народа, строительство его культуры будут коваться в горячих схватках с империалистической реакцией, с мнимыми «друзьями народа».

Опыт культурного строительства в СССР, основанный на ленинских принципах национальной политики нашей партии, может во многом послужить народам «третьего мира» в решении их сложных проблем.

Роль писателя — помочь человеку не только в постановке сложных проблем жизни, но и в нахождении путей их решения, в правильном направлении мыслей, чувств, страстей человека на путь прогресса.

В Ташкенте проходил серьезный разговор по кругу всех этих вопросов, и мы дискутировали с нашими зарубежными коллегами в условиях дружелюбия, желания понять взаимные позиции, с тем чтобы найти решения, вытекающие из коренных исторических интересов народов.

Владимир МАЧАВАРИАНИ,
советский писатель.
(АПН).

Умацоўваецца і развіваецца эканоміка Венгерскай Народнай Рэспублікі. Уступаюць у строй новыя заводы, рэканструююцца і расшыраюцца дзеючыя прадпрыемствы. У раёне возера Балатон пачата рэканструкцыя азотнахімічнага камбіната. Тут будуецца новы завод, які будзе выпускаць сотні тысяч тон высокаэфектыўных хімічных угнаенняў. НА ЗДЫМКУ: від на будаўнічую пляцоўку новага завода.

МЕСЯЧНІК САВЕЦКАЙ НАВУКІ І ТЭХНІКІ Ў БАЛГАРЫІ

Год ад году памнажаюцца і ўмацоўваюцца навукова-тэхнічныя сувязі Савецкага Саюза з Народнай Рэспублікай Балгарыяй. Яны ўстанаўліваюцца не толькі на ўзроўні дзяржаў, але і паміж ведамствамі. Трыццаць адно міністэрства нашай краіны непасрэдна супрацоўнічае з адзінаццаццю міністэрствамі НРБ у вырашэнні актуальных народнагаспадарчых пытанняў, 94 навукова-даследчыя інстытуты Савецкага Саюза і 68 балгарскіх інстытутаў сумесна працуюць над праблемамі, якія маюць цікавасць для навукі і прамысловасці абедзвюх краін.

Так, напрыклад, савецкія і балгарскія інжынеры разам працавалі над стварэннем новай машыны для камвольнага прадзення. Яна дае магчымасць удвая павысіць прадукцыйнасць працы. Укараненне ў баваўняную прамысловасць паточнай механізаванай лініі для кантролю, вымярэння і ўпакоўкі тканін дазволіць штогод эканоміць сотні тысяч рублёў і нашай краіне і Балгарыі.

Акадэмія навук і Міністэрства сельскай гаспадаркі Грузінскай ССР аказвае дапамогу балгарскім калегам у абароне сельскагаспадарчых культур ад граду.

Ідзе інтэнсіўны абмен навукова-тэхнічнай дакументацыяй, які ажыццяўляецца бясплатна. Савецкі Саюз перадаў Балгарыі дакументацыю на выраб поліэтыленавых труб і мантаж трубаправодаў з іх, на тыпавое абсталяванне берагавых радыёстанцый і на многае іншае. А балгарскія таварышы прыслалі дакументацыю на машыны і абсталяванне для камунальнай гаспадаркі, на ткацкую машыну «Янтра» і г. д.

Цяпер у Балгарыі праводзяцца дні савецкай навукі і тэхнікі, у час якіх буйныя савецкія вучоныя і спецыялісты выступаюць у гарадах братняй рэспублікі з дакладамі аб дасягненнях савецкай навукі і тэхнікі. Жыхары і госці Сафіі наведваюць выстаўку «Асваенне космасу ў СССР». У балгарскіх кінатэатрах і па тэлебачанню паказваюцца кінафільмы, якія расказваюць аб перадавым краі навукі і тэхнікі Савецкага Саюза.

ПРАЖСКІ ЗАКАЗ МЕТРАБУДУ

Летам 1967 года ўрад ЧССР звярнуўся да Савецкага Саюза з просьбай дапамагчы ў вырашэнні праблемы арганізацыі скараснога пасажырскага транспарту ў Празе. Савецкія эксперты выехалі ў Чэхаславакію і пасля стараннага вывучэння транспартнай абстаноўкі ў чэхаславацкай сталіцы прыйшлі да аднадушнага заключэння: Празе патрэбна метро.

Аб рабоце групы савецкіх спецыялістаў карэспандэнт «Известий» А. Блахнін папрасіў расказаць яе кіраўніка, начальніка тэхнічнага аддзела інстытута «Метрагіпратранс» С. Жукава.

— Наўрад ці трэба падрабязна спыняцца на тым, чаму выбрана іменна метро, а не паўпадземныя трасы скараснога трамвая, як меркавалася раней, — гаворыць Сяргей Іванавіч. — Для пасажыраў — гэта хуткасць, надзейнасць, камфорт, для горада — разгрузка вуліц ад наземнага транспарту, спрашчэнне многіх архітэктурна-планіровачных праблем.

Работа нашай групы працякала ў цесным кантакце з інжынерамі Пражскага інстытута па праектаванню транспартных збудаванняў.

Першая лінія пражскага метро — так званая лінія «С» — працягнецца на 6,8 кіламетра, перасякаючы горад праз цэнтр з поўдня на поўнач. У далейшым лініі «А» і «В», сустрэўшыся ў нетрах Прагі з радыусам «С», утвораць вялікі падземны трохкутнік. Агульная даўжыня трох ліній каля 60 кіламетраў.

Удзел савецкіх метрабудаўнікоў у пракладцы пражскіх падземных трас не абмяжоўваецца толькі кансультацыямі. СССР абавязаўся паставіць ЧССР некаторыя матэрыялы і канструкцыі, неабходныя пры будаўніцтве тунеляў, горную тэхніку — у прыватнасці, праходчы шчыт. Ён тут асабліва патрэбны, паколькі большую частку пражскага метро (каб не перашкаджаць нармальнаму жыццю горада) мяркуецца пракладваць закрытым спосабам.

Савецкія спецыялісты маюць вялікі вопыт будаўніцтва метро ў пяці гарадах нашай краіны. Удзельнічаючы ў праектных работах, мы імкнёмся даць не толькі найлепшыя рашэнні па камфартабельнасці, дабіцца, каб метро ў Празе адпавядала апошняму слову тэхнікі будаўніцтва метрапалітэна, але і ні на хвіліну не забываем аб эканоміцы.

Паводле папярэдняга плана, тэрмін завяршэння будаўніцтва першай чаргі лініі «С» у сталіцы ЧССР намечаны на 1972 год. Гэта напружаны тэрмін. Але мы перакананы, што пры добрым, творчым узаемадзеянні з савецкімі спецыялістамі чэхаславацкія сябры змогуць вытрымаць яго.

ПАЛАЦ ПАЦЁМКІНА Ў КРЫЧАВЕ

Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй Кацярына II пачала раздаваць сваім прыбліжаным тысячы беларускіх прыгонных сялян. Так Крычаўскае староства, у якое ўваходзіла тады вялікая частка ўсходняй Магілёўшчыны, было падорана князю Р. Пацёмкіну.

Фаварыт царыцы быў нядрэнным арганізатарам. Атрымаўшы права на пастаўку караблёў для новага чарнаморскага флоту і падрады на будаўніцтва ў Херсоне, Севастопалі і іншых партовых гарадах, Пацёмкін заклаў у Крычаве суднаверф, пабудаваў фабрыку па вытворчасці ветразяў, канатны завод. У Крычаве пачалі працаваць цагельчы, шкляны, гарбарны заводы, саладоўня. Мноства розных прадпрыемстваў было створана ў вёсках староства, а таксама ў Хоцімску.

Адначасова пад наглядам палкоўніка Няфедзьева на паўднёва-заходняй ускраіне Крычава быў пабудаван вялікі палац, які меў больш як шэсцьдзесят пакояў. Тут наездамі жыў сам Пацёмкін, сюды на паклон да ўсемагутнага князя з'язджаліся паны. Суткамі грымела музыка, наладжваліся балі і прыёмы. У студзені 1778 года ў гэтым доме начавала сама Екацярына II, якая тады ездзіла па краіне.

План палаца нагадвае манаграму з дзвюх літар «П» і «Е»—«Пацёмкін» і «Екацярына». Два вежападобныя збудаванні на фасадзе надаюць палацу строгасць і манументальнасць.

Цікавай была і ўнутраная планіроўка будынка. На абодвух паверхах адна над адной былі размешчаны вялікія круглыя залы. Побач размяшчаліся дзве вялікія прамавугольныя залы. Было і шмат пакояў меншых. На паўднёвым баку на другім паверсе знаходзілася спальня з прыгожай лепкай, калонамі.

У канцы XVIII стагоддзя Крычаўскае староства, у тым ліку ўсе будынкі, Пацёмкін прадаў памешчыку, палкоўніку Івану Галынскаму, адчаму са злосных прыгнятальнікаў беларускага народа. Іменна тут адзін з Галынскіх у 1812 годзе хваліўся, што збярэ не менш 20 тысяч войска на дапамогу Напалеону, аб чым было паведамлена М. Кутузаву.

Паказальна, што Іван Галынскі хутка прывёў у непрыгоднасць верф, спыніў вытворчасць нечаторых каштоўных тавараў. Галоўным клопатам для яго былі бровары, бо яны давалі вялікія прыбыткі.

У 1917 годзе ў будынку палаца адкрылася першая ў гэтых мясцінах савецкая школа, якой неўзабаве прысвоілі імя Ул. І. Леніна. У гэтай школе вучыліся многія нашы слаўныя землякі: Герой Савецкага Саюза генерал арміі І. Гусакоўскі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі літаратар Я. Мазалькоў, былы міністр замежных спраў БССР К. Кісялёў, рэдактар падпольнай «Звязды» ў 1943—44 гг. М. Барашкай, галоўны інжынер Брацкгэсбуда Герой Сацыялістычнай Працы А. Гіндзін і многія іншыя. У 50-х гадах палац аддадзены пад спальны корпус школы-інтэрната.

В. МЕЛЬНІКАЎ.

Кастрычнік.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

ЗАЛАТЫЯ БАРХАНЫ

У сэрцы Кызылкумаў, у мястэчку Айтым, геолагі трэста «Самаркандгеалогія» выявілі новае месцанараджэнне золата. Пакуль яшчэ немагчыма канкрэтна назваць памеры новага месцанараджэння, але яны, бясспрэчна, значныя. Многія аўтарытэтныя вучоныя лічаць, што яго запасы не ўступяць Мурунтау — аднаму з буйнейшых месцанараджэнняў золата ў краіне.

Аб незлічоных багаццях Кызылкумаў вядома здаўна. Сляды старажытных распрацовак указваюць іншы раз геолагам правільны курс. У Айтыме ёсць некалькі курганоў. Цяпер там бураць шчыліны. Можа, яны прывядуць да натуральных скарбніц бухарскіх правіцеляў. І, можа, нарэшце, вырашыцца загадка: куды схаваў свае багацці апошні эмір Бухары перад уцёкамі за граніцу.

(АДН).

ГУМАР

— Што б вы падумалі пра мяне, калі б я паслаў вам паветраны пацалунак?

— Што вы вялікі гультай!

●

У кабінеце дырэктара школы зазваніў тэлефон.

— Таварыш дырэктар, мой сын сёння не можа прыйсці ў школу.

— А хто гэта гаворыць?

— Гэта гаворыць мой бацька.

●

Парыжанін, які праводзіў адпачынак у вёсцы, пахваліўся ў сельскім бістро, што можа распазнаць любы напітак, які яму прапануюць. Карчмар спусціўся ў падвал і вярнуўся, несучы ў руцэ бакал, наполнены бесталяровай вадкасцю. Парыжанін адзіным духам асушыў бакал і крыкнуў:

— О-о-о! Але гэта ж бензін!

— Брава! Звычайны ці высокаактанавы?

●

Швейцарскае «Таварыства стойкіх мужоў», члены якога жанаты 25 год і больш, згадзілася адказаць на пытанні, якія хвалююць халасцякоў. Першае пытанне было: «Якія жанчыны з'яўляюцца самымі вернымі і адданымі: бландынкі ці брунеткі?» Адказ: «Сівыя».

●

На адным са званых вечароў вядомы ў Мехіка кампазітар Луіс Сіснера выконваў фрагменты са сваіх твораў. Скончыўшы ігру, ён звярнуўся да госця, які стаяў побач: «Я бачу, вы любіце добрую музыку». «Так, сапраўды, — адказаў госць, — але гэта не павінна вас бянтэжыць. Вы можаце працягваць сваю ігру».

●

Акцёр-навічок, які дэбюціраваў у адным з тэатраў Мехіка, на наступны дзень спытаў свайго таварыша: «Ты глядзеў учора п'есу, у якой мне давялося іграць?» «Ну, а як жа,—адказаў той. — Няўжо ты не заўважыў у глядзельнай зале адзінага чалавека, які табе апладзіраваў?»

●

Малады чалавек бярэ напракат каня. Гаспадар стайні папярэджвае яго, што гадзіна верхавой язды каштуе 20 песа, але грошы трэба плаціць наперад. «Вы баіцеся, што я вярнуся без каня?»—здзіўляецца кліент. «Зусім наадварот, — адказвае гаспадар, — я баюся, што конь вернецца без вас».

НАШЫ ВЫДАННІ

Пяцідзесяцігадоваму юбілею БССР і Кампартыі Беларусі прысвечана новая кніжка бібліятэчкі газеты «Голас Радзімы». Яе аўтар журналіст А. Тоўсцік знаёміць чытача з нялёгкім, але слаўным шляхам, які прайшла Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, створаная 1 студзеня 1919 года.

Гаротным быў лёс беларусаў у царскай Расіі. 80 працэнтаў сялян пакутавала ад малазямелля, 10 працэнтаў наогул не мелі сваіх надзелаў. У пошуках працы пакідалі людзі родныя хаты, перасяляліся на неабжытыя землі, ад'язджалі ў заморскія краіны. Паўтара мільёна чалавек выехала з Беларусі.

Новае жыццё нашаму народу прынёс Кастрычнік 1917 года. Рабочыя атрымалі працу, сяляне — зямлю. Адкрыліся школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы. Да 1940 года ў рэспубліцы было пабудавана 1 700 новых прамысловых прадпрыемстваў.

Вераломны напад гітлераўцаў перапыніў мірнае будаўніцтва, якое вяла Беларусь. Незлічоныя страты прынесла вайна нашай рэспубліцы. Звыш 2 мільёнаў 200 тысяч сваіх сыноў і дачок не далічыўся беларускі народ. Але зямля, па якой шугала полымя партызанскай вайны, гарэла пад нагамі акупантаў. У партызанскіх атрадах змагалася 374 тысячы патрыётаў, 70 тысяч чалавек вялі падпольную работу ў гарадах і пасёлках.

З пяцідзесяці год, якія пражылі беларусы пры Савецкай уладзе, амаль два дзесяткі былі змарнаваны на войны, што навязалі нам захопнікі, і аднаўленне свайго краю. І ўсё ж за гэты час Беларусь з адсталай ускраіны царскай Расіі ператварылася ў магутную індустрыяльную рэспубліку, якая дэманструе на міжнародных кірмашах і выстаўках свае самазвалы, электронныя машыны, станкі, камбайны, матацыклы, тэлевізары, радыёпрыёмнікі, вырабы хімічнай, лёгкай і харчовай прамысловасці.

На палях рэспублікі працуюць звыш 60 тысяч трактараў, каля 22 тысяч камбайнаў, больш 45 тысяч грузавых аўтамабіляў і шмат іншай тэхнікі.

У 28 вну рэспублікі займаюцца 116 тысяч студэнтаў, у 126 сярэдніх спецыяльных навучальных установах вучацца 135 тысяч юнакоў і дзяўчат. У народнай гаспадарцы БССР працуе 430 тысяч чалавек — у два з лішнім разы больш, чым ва ўсёй дарэвалюцыйнай Расіі.

Вялізная армія медыцынскіх работнікаў стаіць на варце здароўя працоўных. На дзесяць тысяч насельніцтва прыходзіцца 22 урачы. У гэтым сэнсе Беларусь, у мінулым край каўтуна і трахомы, апярэдзіла Францыю, ФРГ і ЗША.

БССР — член-заснавальнік ААН — адыгрывае важную ролю на міжнароднай арэне, падтрымлівае гандлёвыя сувязі з 77 краінамі свету.

Змяніла аблічча беларуская зямля: асушана спрадвечная багна, з канца ў канец працягнуліся стужкі сталёвых рэек і шасейных дарог, узняліся новыя гарады. Сваё пяцідзесяцігоддзе рэспубліка сустракае новымі працоўнымі здзяйсненнямі.

ПАРЫЖ, ШТО ПАД ЧЭЛЯБІНСКАМ...

Чэлябінскі аэрапорт. Рэпрадуктары разносяць голас дыктара: «Аб'яўляецца пасадка на самалёт, які накіроўваецца праз Фершампенуаз да Магнітагорска».

Вы не памыліліся. Сапраўды—Фершампенуаз! Але адкуль гэта французская назва ў цэнтры Расіі?

Аматары тапанімікі знойдуць у Чэлябінскай вобласці нямала цікавага. Тут ёсць вёскі, якія носяць імёны — Лейпцыг, Барадзіно, Таруціна; ёсць пасёлкі з назвамі — Парыжскі, Берлінскі, Варшаўскі, Касельскі, Бярэзінскі. У штодзённым ужытку іх называюць проста Парыж, Берлін, Варшава...

Такія назвы населеных пунктаў з'явіліся тут у 20—30-х гадах мінулага стагоддзя. Іх далі сваім вёскам паўднёвауральцы — удзельнікі Айчыннай вайны 1812 года ў памяць аб слаўных перамогах рускай зброі.

ШТУЧНАЯ НЫРКА «ДЫЯХРОН-80»

Амаль дзесяць год назад у СССР была створана штучная нырка. Гэты айчынны апарат паспяхова ўжываецца цяпер больш чым у ста клініках краіны. Тысячы людзей, якія пакутуюць нырквай недастатковасцю, дзякуючы аперацыям гемадыялізу, праведзеным пры дапамозе штучнай ныркі, выратаваны.

Савецкі апарат «Штучная нырка» экспартуецца ў 20 краін свету. Яго ўжываюць у лекавых установах Балгарыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Японіі, Швецыі. Нядаўна савецкія апараты ўстаноўлены ў бальніцах В'етнама і Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі.

Супрацоўнікі Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута хірургічнай апаратуры і інструментаў Міністэрства аховы здароўя СССР пад кіраўніцтвам доктара тэхнічных навук Юрыя Казлова стварылі новую мадэль штучнай ныркі—«Дыяхрон-80». Яна прызначана для лячэння хворых, якія пакутуюць хранічнай нырквай недастатковасцю. Новы апарат патрабуе для свайго пярвічнага запаўнення ўсяго 80—100 кубічных сантыметраў крыві, у некалькі разоў менш, чым замежныя штучныя ныркі.

Штучная нырка «Дыяхрон-80» паспяхова прайшла выпрабаванні ў клініках Масквы.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

НАШ АДРАС: МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 77

ТЭЛЕФОНЫ: 6-19-31, 6-97-92, 6-18-88, 3-15-15.